РАЦЫЯ (https://www.racyja.com)

серада, 15 студзеня 2020, 10:49

**БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ Беласток, Гародня 98,1 FM Берасце 99,2 FM**

# Арыгінал Берасцейскай Бібліі прадставяць шырокай грамадскасці

23 гадзіны таму

Прэзентацыя арыгінала Берасцейскай Бібліі адбудзецца 14 студзеня ў Музеі гісторыі горада Берасця, паведаміў намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі **Алесь Суша**.



„Гэта той самы экзэмпляр, які ў верасні 2019 года кіраўнік дзяржавы перадаў у дар гораду на 1000-годдзе. Экзэмпляр вельмі цікавы, добра захаваны. На яго старонках мноства самых розных маргіналій, якія могуць шмат што расказаць пра лёс рарытэта", – адзначыў Алесь Суша.

Паводле яго слоў, гарадскія ўлады знайшлі магчымасць закупіць самае сучаснае абсталяванне спецыяльна для гэтай прэзентацыі і далейшага экспанавання ўнікальнага помніка. „Мы аналізавалі і прапаноўвалі берасцейскім калегам розныя варыянты вітрын і тэхнікі, даступнай у Беларусі, для найбольш удалага паказу знакавага кніжнага помніка. І быў выбраны лепшы", – расказаў намеснік дырэктара.

**belta.by** (https://blr.belta.by/culture/view/aryginal-brestskaj-biblii-pradstavjats-shyrokaj-gramadskastsi-84303-2020/)